**Стратэгія актыўнай ацэнкі ў сістэме кантрольна-ацэначнай дзейнасці**

**Г. В. Лапшэвіча,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі
гімназіі №1 г. Астраўца

У любой дзейнасці неабходнымі элементамі з'яўляюцца кантроль і ацэнка. Менавіта яны рэгулююць гэтую дзейнасць, даюць чалавеку інфармацыю аб тым, наколькі паспяхова ідзе працэс, якія існуюць складанасці. Гэта яму дазваляе ў выпадку неабходнасці карэкціраваць свае дзеянні.

Кантроль і ацэньванне – неабходная і важная частка адукацыйнага працэсу. Ад таго, як ажыццяўляецца праверка і ацэнка ведаў вучняў, залежыць іх вучэбная дысцыпліна, адносіны да вучобы, фарміраванне цікавасці да прадмета, а таксама развіццё такіх якасцей, як самастойнасць, ініцыятыўнасць, працавітасць.

Праблема ацэнкі і ацэначнай дзейнасці – адна з самых актуальных як у педагагічнай тэорыі, так і ў педагагічнай практыцы. У многім яе эфектыўнасць яе вырашэння залежыць ад таго, наколькі правільна настаўнік і самі вучні гэтую дзейнасць ажыццяўляюць.

Настаўнік у сваёй рабоце павінен выкарыстоўваць не толькі агульнапрынятыя формы кантролю (самастойная і кантрольная работы, вуснае апытванне ля дошкі і інш.), але і сістэматычна вынаходзіць і выкарыстоўваць свае сродкі кантролю.

Сістэматычны кантроль ведаў і ўменняў вучняў – адна з галоўных умоў павышэння якасці навучання. Умелае валоданне настаўнікам рознымі формамі кантролю спрыяе павышэнню зацікаўленасці ў навучанні, папярэджвае адставанне, забяспечвае актыўную работу кожнага вучня.

Як лепш перадаць і праверыць веды? Як мы павінны дзейнічаць, каб стварыць спрыяльныя ўмовы для навучання? Што рабіць, каб вучань адчуў адказнасць за ўласнае навучанне? Майстар-клас дапаможа нам знайсці адказы на гэтыя пытанні.

**Мэты:**

- актуалізацыя ведаў педагогаў пра асноўныя метады і сродкі кантрольна-ацэначнай дзейнасці;
- знаёмства з псіхалагічнымі аспектамі арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці і іх уплывам на матывацыю вучняў;
- папулярызацыя стратэгіі актыўнай ацэнкі сярод удзельнікаў майстар-класа;
- стварэнне ўмоў для самаадукацыі і самаўдасканалення педагогаў.

**Працягласць:** 45–50 хвілін.

**Колькасць удзельнікаў:** 12–15 чалавек.
**Абсталяванне:** мультымедыйная ўстаноўка для дэманстрацыі прэзентацыі; лісты фармату А–4, маркеры; дошка, каляровая крэйда.

**Ход майстар-класа**

**1. арыентацыйна-матывацыйны этап**

**Майстар.** У каго ёсць у кішэні апельсін? А ў мяне ён ёсць.*)* Пачакаем, можа ён з'явіцца ў вас... Нешта адбываецца? Апельсін з'явіўся каля вас? У вас у кішэні? У руках? Хто жадае мець яго ў кішэні? Калі ласка, вазьміце! *(Чалавек падыходзіць, бярэ апельсін.)*
Што атрымалася? Чалавек атрымаў апельсін? Ён выканаў нейкае дзеянне, падышоў і забраў.

Вынік. Каб нешта атрымаць, набыць, трэба праявіць актыўнасць. Толькі ад вас залежаць вашы веды. Вы вучыцеся для сябе, і вучні вашы вучацца не для настаўніка або бацькоў. І чым хутчэй яны гэта ўсвядомяць, тым лягчэй вам будзе вучыць іх.

**ПРАКТЫКАВАННЕ “Намалюйце школу”**

Заданне слухачам: намалюйце, калі ласка, школу *(без усякіх каментарыяў).* Ацаніце сябе. Затым ацэньваю я.

- У каго адзнакі супалі?
- Ці ўсе задаволены маімі адзнакамі? Чаму?
- Я ставіла “10” толькі тым, хто намаляваў трохпавярховую школу.
- Якая ў мяне, як педагога, была памылка ў пачатку задання? *(Не вызначыла агульных крытэрыяў ацэнкі.)* І гэта часта сустракаецца ў нашай педагагічнай практыцы.

**Крытэрыі ацэнкі (НАШТОБУЗУ)**

Элементам актыўнай ацэнкі, які непарыўна звязаны з мэтамі і выступае моцным інструментам зваротнай сувязі, з'яўляецца крытэрый дасягнення мэты, так званы НАШТОБУЗУ («на што буду звяртаць увагу»). Плюсам НАШТОБУЗУ лічу тое, што змест кантролю становіцца адкрытым, незасакрэчаным
Пры арганізацыі кантролю ведаў навучэнцаў важна тое, каб перад праверкай вучні ведалі *нормы ацэнкі і крытэрыі ацэньвання.* З нормамі ацэнкі я знаёмлю навучэнцаў на першых уроках. Працу па фарміраванню крытэрыяў ацэньвання мне дапамагаюць арганізаваць прыём “Критерии “5П” для ответа
учащегося” і элементы методыкі актыўнай ацэнкі: перавод задач урока на мову навучэнцаў і “НАШТОБУЗУ”.“

**2. Актуалізацыя суб'ектыўнага вопыту ўдзельнікаў**
***(Майстар цікавіцца, ці ведаюць педагогі, што абазначаюць тэрміны “ацэнка», і “адзнака”)***
**Метад кантролю** – гэта сістэма паслядоўных узаемазвязаных дыягнастычных дзеянняў настаўніка і вучняў, якая забяспечвае зваротную сувязь у працэсе

навучання з мэтай атрымання інфармацыі пра паспяховасць навучання, эфектыўнасць вучэбнага працэсу.

**Сродкі кантролю** – гэта вучэбныя матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца для праверкі ўзроўню ведаў.

***Заданне для работы ў групах: вылучыць наступныя метады праверкі вынікаў навучання:***

**Вусны кантроль** (гэта гутарка, аповед вучня, тлумачэнне, чытанне тэкста, паведамленне пра ўласны вопыт і інш.

Аснову вуснага кантролю складае:

- Маналагічны адказ вучня;
- Форма "пытанне–адказ".

Вусны кантроль праводзіцца на кожным уроку ў індывідуальнай, франтальнай або камбінаванай форме. Індывідуальнае апытванне вучняў дазваляе настаўніку атрымаць больш поўныя дадзеныя пра ўзровень засваення ведаў, аднак яно пакідае пасіўнымі на ўроку іншых вучняў, што прымушае настаўніка вырашаць праблему іх занятасці ў час апытвання. Франтальнае апытванне займае ўсіх вучняў адразу, але дае болш павярхоўнае ўяўленне пра засваенне імі ведаў.

Найбольш актыўнай і грунтоўнай праверкай ведаў за вызначаны перыяд навучання з'яўляюцца залік і вусны экзамен.

**Пісьмовы кантроль** (кантрольная работа, пераказ, сачыненне, дыктант, рэферат і інш.) забяспечвае глыбокую і рознабаковую праверку засваення ведаў, таму што патрабуе прымянення комплексу ведаў і ўменняў . У пісьмовай рабоце вучню трэба паказаць і тэарэтычныя веды, і ўменне прымяняць іх для вырашэння канкрэтных задач, праблем. Акрамя таго, выяўляецца ступень валодання пісьмовым маўленнем, уменне лагічна складаць свой тэкст, даваць ацэнку твору і інш.

**Самакантроль** (вучні свамастойна шукаюць памылкі, аналізуюць прычыны няправільнага вырашэння пастаўленай задачы, пазбаўляюцца ад прабелаў у ведах).

**3. інфармацыйна-дзейнасны этап**

**Вусны кантроль**

*(Майстар звяртаецца да любога ўдзельніка і просіць яго адказаць на пытанне. Потым мяняе тактыку: задае пытанне, просіць удзельнікаў абмерка-ваць яго ў парах і праз хвіліну даць адказ.)*

Першы аспект тактыкі пастаноўкі пытанняў, якія варта прааналізаваць, – <u>сувязь паміж ступенню складанасці пытання і часам чакання адказу</u>. Даследаванні паказалі, што настаўнікі чакаюць адказ вучня 0,9 секунды. Часта задаем пытанне наступным чынам: «Аляксей, што такое здаровы лад жыцця?» – і спадзяёмся, што той адкажа адразу ж. Што адбываецца ў гэтай сітуацыі ў класе і з Аляксеем? Калі вучань не мае праблем з навучаннем і дастаткова смелы, ён дае адказ адразу. Астатнія вучні пры гэтым не стануць разважаць над адказам, таму актывізацыя іх

увагі падае. Калі ж Аляксей нясмелы, то з той хвіліны, як толькі пачуў сваё імя, ён адчувае страх і неспакой, у яго адразу ўзнікаюць думкі, ШТО хоча пачуць настаўнік і ЯК адрэагуе клас, калі ён памыліцца. Гэта дакладна не спрыяе ні мысленню, ні навучанню. Прапанаваная актыўнай ацэнкай тактыка пастаноўкі пытанняў грунтуецца на тым, каб спачатку задаць пытанне, пасля пакінуць час на роздум (адэкватны ступені цяжкасці пытання і дастатковы, каб нават нясмелыя і няўпэўненыя дзеці здолелі засяродзіцца) і толькі тады выбраць вучня, які павінен даць адказ.

Увядзенне <u>прынцыпу неўздымання рук</u> – другі аспект тактыкі пастаноўкі пытанняў. Гэты прынцып дапамагае настаўніку лепей кантраляваць, наколькі раўнамерна ён апытвае ўсіх вучняў, ці не абмінае адных і не вылучае іншых. Можна яшчэ прапанаваць цягнуць карткі з імёнамі вучняў – гэта ўнясе элемент латарэі-гульні і палепшыць агульную атмасферу ў класе, зробіць яе больш спрыяльнай для навучання.

<u>Належная рэакцыя на памылковы адказ вучня</u> – трэці аспект тактыкі пастаноўкі пытанняў. Відавочна, што настаўнік незадаволены, калі вучань няправільна адказвае на пытанне, нягледзячы на тое што было прыкладзена шмат намаганняў на тлумачэнне матэрыялу. Памылковы адказ сведчыць, што вучань мае нейкую праблему альбо тлумачэнні былі недастатковымі ці незразумелымі. Належнай рэакцыяй на памылковы адказ вучня будзе спакойнае выпраўленне. Можа нават здарыцца, што такая памылка стане выдатным ключавым пытаннем да наступнага ўрока, калі яна вынікае з няведання, звязанага з далейшым матэрыялам. Сярод аспектаў тактыкі пастаноўкі пытанняў найбольш спрыяльны для навучання чацвёрты: <u>пошук адказу ў парах</u>. Мне вельмі падабаецца работа ў парах, яна дапамагае дзецям зняць напружанне. Калі вучань чагосьці не ўмее ці не ведае, але даведаецца ці пачуе ад сябра, ён лягчэй можа гэта запомніць.

**“Крытэрыі “5П” для адказу вучня”:**

- Правільнасць
- Паўната
- Паслядоўнасць
- Прыклады
- Патлумачыць прыклады

Гэтыя крытэрыі дазваляюць навучэнцу ажыццявіць самакантроль і даць самаацэнку адказу (асабліва вуснаму).

**Ключавыя пытанні**

Мы ахвотна вучымся таму, да чаго маем цікавасць, што нас інтрыгуе, што неабходна нам для дасягнення мэты. Мы імкнёмся зразумець і лёгка запамінаем тое, што нас цікавіць. Варта зазначыць, што ключавыя пытанні не абавязкова павінны мець рысы пытанняў: гэта можа быць праблема, гіпотэза, загадка, задача, тэзіс, сітуацыя, малюнак ці здымак, калаж і нават паводзіны настаўніка.

Калі настаўнік задае ключавое пытанне ў той ці іншай форме, ён дае абяцанне, што вучні знойдуць на яго адказ у канцы ўрока ці праз некалькі ўрокаў. Пры ўмове,

вядома, што яны для гэтага прыкладуць належныя намаганні. Але не кожнае пытанне можна назваць ключавым.

1. Пажадана па магчымасці адмаўляцца ад пастаноўкі пытанняў, адказы на якія настаўнік ведае сам. Напрыклад, замест пытання «Што называецца інверсіяй?» лепш спытаць «Як ты разумееш гэтую з'яву – інверсія?». Такім чынам замест закрытага пытання, адказ на які настаўнік ведае, ён пытае тое, чаго сам не ведае: як вучань разумее гэтую з'яву. Пры гэтым навучэнцу становіцца зразумела, што для настаўніка галоўным з'яўляецца не інерцыя, а ён (вучань), яго разуменне гэтай з'явы. Прапаноўваецца часцей прымяняць адкрытыя пытанні, на якія няма адказу ў падручніках і, магчыма, настаўнік сам не ведае, як правільна адказаць. Гэта пытанні, адказы на якія могуць мець альтэрнатывы, ствараюць перадумовы для вылучэння вучнямі сваіх версій і ідэй, стымулююць іх мысліцельную актыўнасць, развіваюць крытычнае мысленне.

Заданне групам: запоўніце пропускі ў табліцах.

Ключавыя пытанні на ўроках беларускай літаратуры

| Клас | Тэма ўрока | Ключавое пытанне |
|---|---|---|
| 9 | М.Багдановіч. Жыццёвы і творчы шлях | Шчаслівы ці няшчасны лёс М.Багдановіча? |
| 11 | І.Навуменка. Апавяданне “Сямнаццатай вясной” | |
| 8 | А.Дудараў. П'еса “Вечар” | |
| 8 | В.Быкаў. Аповесць “Жураўліны крык” | |

Ключавыя пытанні на ўроках беларускай мовы

| Клас | Тэма ўрока | Ключавое пытанне |
|---|---|---|
| 7 | Злучнік як службовая часціна мовы | Чаму ў маўленні нельга абысціся без злучнікаў? |
| 7 | Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу | |
| 9 | Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі. Знакі прыпынку ў іх | |
| 8 | Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам | |

**Пісьмовы кантроль**

Дзеці неаднолькавыя: адны бездакорна выконваюць тэсты, другія добра пішуць сачыненні, але дапускаюць памылкі, трэція могуць разважаць, бачыць незвычайнае ў звычайным. Таму імкнуся падысці да складання кантрольных заданняў творча, нетрадыцыйна. Напрыклад, прапаную пераклад з беларускай мовы на …

беларускую: тэкст мастацкага стылю паспрабаваць “перакласці” на афіцыйную мову.

**Тэставы кантроль**

Заслугоўвае ўвагі і **работа з тэстамі**, якая прадстаўляе вучням магчымасць праявіць самастойнасць, індывідуальнасць, садзейнічае фарміраванню навыкаў самааналізу і самакантролю. Перад напісаннем кантрольнай тэставай работы (9-11 класы) часта даю вучням трэніровачныя тэсты, пры гэтым прапаноўваю выкарыстоўваць наступную памятку.

**Памятка**

1. Прачытай усе заданні тэста і адзнач знакам “+” тыя з іх, якія можна выканаць адразу, без падрыхтоўкі.
2. Адзнач знакам “-“ заданні, над якімі ты хацеў бы папрацаваць, паўтарыўшы правілы.
3. Выканай заданні, пазначаныя знакам “+”. Правер сябе па ключы.
4. Знайшоў памылкі? Вызнач, якое правіла патрэбна паўтарыць. Патрэбна дапамога? Звярніся да настаўніка.
5. Закончыўшы працу над тэстам, абагульні вынікі ў форме табліцы.

| Ведаю і ўмею | Не ведаю, не ўмею | Правілы, якія неабходна паўтарыць |
|---|---|---|
| | | |
| | | |

6. Паўтары правілы і паспрабуй выканаць заданні яшчэ раз.

**Самакантроль**

На падставе вызначаных крытэрыяў вучні могуць праглядаць працы адзін аднаго і даваць парады для іх паляпшэння. Гэта так званая ўзаемаацэнка, якая мае двайное значэнне: з аднаго боку, вучань добра разумее таварыша, чыю працу праглядае, таму што сам толькі што вырашаў тую ж задачу, а з другога – вучыцца ў яго. Калі вучань сам ацэньвае аб'ём сваіх ведаў, а таксама тое, што яшчэ неабходна зрабіць, каб дасягнуць жаданай мэты, то ён становіцца актыўным удзельнікам працэсу навучання.

**4. Рэфлексіўны этап**

Майстар прапануе малюнкі скрынка для смецця, шуфляды.

Кожны ўдзельнік выбірае, што пакладзе сабе ў кішэню (будзе выкарыстоўваць у сваёй педагагічнай дзейнасці), закіне ў шуфляду (можа, калі і спатрэбіцца) або выкіне ў скрынку для смецця (не патрэбна, бо працую па-іншаму).